Без внедрения достижений науки не обходился ни один вид транспорта. Комплексные схемы развития городского транспорта, как самостоятельный вид проектных работ, стали разрабатываться в БССР с 1965 года. В 1973 г. работниками Минского филиала Центрального научно-исследовательского и проектного института градостроительства были разработаны комплексные транспортные схемы Минска, Витебска, Могилёва и Гродно на расчётный период до 1980 г. [5, с. 34]. Данные действия позволяли более успешно решать вопросы организации пассажирских перевозок в городах, особенно крупных.

По запросам работников белорусского речного транспорта Центральное технико-конструкторское бюро Министерства речного флота РСФСР с 1950-х гг. составляло проекты пассажирских теплоходов, в том числе и из пластмассы. Исходя из заказов белорусских речников коллектив горьковского завода «Красное Сормово» спроектировал и изготовил корпус теплохода «Ракета». Все это принесло удобства будущим пассажирам.

В интересах белорусского воздушного транспорта работал Центральный институт авиационного моторостроения, Центральный аэрогидродинамический институт. Совместно с другими институтами в начале 1980-х гг. они рассматривали нефтяной и природные газы как эффективные заместители авиакеросинов, значительно превосходившие их по экономическим, экологическим и техническим параметрам

**Заключение.** От внедрения в перевозки разработок и рекомендаций научно-исследовательских институтов и заводских лабораторий на автомобильном транспорте получался экономический эффект на миллионы рублей, на железнодорожном транспорте – на десятки миллионов рублей в год. По всем видам транспорта ускорялись перевозки грузов, они доходили более крупными партиями. Перевозки становились более надежными и рентабельными, облегчался труд рабочих и служащих.

1. Петрукович, А. Совместно с производственниками / А. Петрукович// Советская Белоруссия. – 1959. – 31 июля. – С. 3.
2. Миташвили, А. Транспортные издержки народного хозяйства / А Миташвили // Вопросы экономики. – 1982. - № 3. – С. 42–53.
3. Андреев, А. Путь без привалов / А. Андреев // Политинформатор и агитатор. – 1982. – № 20. – С. 22–23.
4. Пузиков, П. Научно-техническая революция и развитие науки / П. Пузиков // Коммунист Белоруссии. – 1975. – № 9. – С. 30.
5. Корнейчик, В.М. Опыт проектирования комплексных транспортных схем / В.М. Корнейчик // Строительство и архитектура Белоруссии. – 1974. – № 4. – С. 34–35.

## II З'ЕЗД БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ І ЯГО РАШЭННІ

*А.Д. Тогулева*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У другой палове XIX стагодзя адбываецца фарміраванне беларускага нацыянальнага руху, ад моладзевых гурткоў беларускі рух у пачатку XX стагоддзя дайшоў да утварэння першай беларускай нацыянальнай палітычнай партыі – Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), якая аб'ядноўвала ў сваіх радах прадстаўнікоў розных сацыяльных груп – ад селяніна да буйнога шляхціча, адстойвала нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы беларускага этнасу, выступала за дзяржаўную аўтаномію Беларусі. У 1903 годзе адбыўся першы з'езд БСГ, дзе была ўтворана палітычная партыя, а ў 1906 годзе – II з'езд.

Мэта працы – раскрыць працэс прыняцця на II з'ездзе і змест разгорнутай палітычнай праграмы БСГ, якая вызначыла стратэгічныя мэты, тактыку партыі.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыялу былі выкарыстаны дакументы з фондаў НАРБ, праграма БСГ, прынятая на II з'ездзе партыі, артыкулы дзеяча беларускага нацыянальна-вызваленчага руху А. Луцкевіча. Рэалізаваны лагічныя метады даследавання, а таксама метады гістарычна-параўнальнага і сістэмна-комплекснага аналізу навуковай літаратуры і крыніц.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У студзені 1906г. у Мінску быў скліканы II з'езд БСГ, на парадак дня якога былі пастаўлены наступныя пытанні: перагляд партыйнай праграмы, распрацоўка аграрнай праграмы і тактыкі партыі, арганізацыйныя пытанні і выбранне ЦК. На з'ездзе прысутнічалі: з Мінску – Іван і Антон Луцкевічы, А. Уласаў, К. Кастравіцкі, В. Зелязей, А. Шабуня і сялянскія дэпутаты з Ігуменскага, Мінскага і Слуцкага паветаў; з Вільні – А. Пашкевіч, А. Бурбіс, Ф.Стэцкевіч; з Пецярбургу – В.Іваноўскі і інш. [1, с. 27].

Праграма партыі, якая была прынята на гэтым з’ездзе, дзялілася на тры часткі. У першай заяўлялася, што БСГ арганізуе “працавітую беднату Беларускага краю без адрознення нацыянальнасцей” з канчатковай мэтай замены капіталістычнага ладу сацыялістычным, замены прыватнай уласнасці на прылады вытворчасці і абароту – грамадскай дзеля арганізацыі грамадскай вытворчасці”. Найбліжэйшай сваёй задачай Грамада абвяшчала звяржэнне самадзяржаўя разам з пралетарыятам усёй Расіі і выказвалася за стварэнне Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі са свабодным самавызначэннем і культурна-нацыянальнай аўтаноміяй народнасцей. Для Беларусі Грамада патрабавала дзяржаўнай аўтаноміі з мясцовым сеймам у Вільні. Далей у праграме адзначалася, што “Дэмакратычная Рэспубліка павінна будавацца на грунце наступных прынцыпаў: 1. Заканадаўчая ўлада народа, як санкцыя і як ініцыятыва: сканцэнтраванне вярхоўнай ўлады ў руках заканадаўчага органа. 2. Усеагульнае, прамое, роўнае, выбарчае права, тайнае галасаванне пры выбарах, прапарцыянальныя выбары. 3. Самае шырокае абласное, мясцовае і т.п. самакіраванне. 4. Роўныя правы для ўсіх народнасцей, якія жывуць на адной тэрыторыі (культурна-нацыянальная аўтаномія). 5. Раўнапраўе ўсіх грамадзян без адрознення пола, рэлігіі, нацыянальнасцей і расы; знішчэнне сасловій. 6. Выбарнасць чыноўнікаў. 7. Даравой суд, выбарныя суддзі. 8. Поўная свабода сумлення, слова, друку, сходаў, саюзаў, стачак і забастовак. 9. Недатыкальнасць асобы і жылля.10. Даравая поўная абавязковая адукацыя для ўсіх за кошт дзяржавы. 11. Знішчэнне пастаяннага войску, усеагульнае апалчэнне народа. 12. Знішчэнне ўсіх ускосных падаткаў, устанаўленне прагрэсіўнага падатка на даходы і спадчыну” [2, с. 158–159].

Другая частка праграмы складалася з патрабаванняў у галіне рабочага заканадаўства. У ёй БСГ прапанавала ўстанавіць 8-гадзінны працоўны дзень, мінімум заработнай платы за працу і паляпшэнне яе ўмоў, аднолькавую аплату мужчынам і жанчынам за аднолькавую працу. Партыя выступала за забарону начной працы і працы дзяцей да 14 год, абмежаванне працоўнага часу для падлеткаў (ад 14 да 18 гадоў 6-ю гадзінамі ў дзень), устанаўленне штотыднёвага адпачынку. БСГ лічыла неабходным дабівацца бясплатнай медыцынскай дапамогі, дзяржаўнага страхавання ад няшчасных выпадкаў, хваробы, старасці і недахопу працы. Дзеля кантролю за дзейнасцю адміністрацыі, абароны сваіх правоў партыя прапаноўвала стварыць фабрычную і сельскую інспекцыі, якую б выбіралі самі рабочыя” [2, с. 160].

Самая гарачая дыскусія на з’ездзе ўзнікла ў адносінах да трэцяй часткі праграмы, якая была прысвечана вырашэнню аграрнага пытання. Спрэчка ўзнікла паміж братамі Луцкевічамі, бо кожны з іх меў свой погляд на вырашэнне гэтага пытання. Як указвае Антон Луцкевіч [1, с. 24], яго брат лічыў неабходным даць сялянству, як больш зразумелы яму, лозунг “дзялі зямлю”, які быў разлічаны на працяг і ўзмацненне рэвалюцыі, ён глядзеў на яе развіццё больш аптымістычна, чым іншыя дэлегаты з’езда. Антон Луцкевіч, які разам з А. Уласавым падрыхтаваў да з’езда праект аграрнай праграмы, наадварот, схіляўся да погляду, што рэвалюцыйны выбух ужо заканчваецца, і пачынаецца рэакцыя, супраць якой партыя бяссільная, і таму яго праект праграмы па зямельным пытанні як бы прадугледжваў наперад доўгі шлях да ажыццяўлення. У аснову яго праграмы павінна было легчы абагульненне ўсіх памешчыцкіх, царкоўных, казённых і ўдзельных зямель, якія складалі нацыянальны зямельны фонд Беларусі, з тым, каб з гэтых зямель утварыліся рацыянальна арганізаваныя хутары, якія б былі здольныя пры дастатковай колькасці зямлі, не толькі пракарміць сялянскую сям’ю, але і пастаўляць хлеб і іншыя сельскагаспада- рчыя прадукты на рынак у горад. Пры дапамозе краёвай улады такія хутары павінны былі б арганізоўваць шляхам кааперацыі вытворчыя прадпрыемствы, і тыя, якія пераапрацоўваюць сыравіну на месцы, тымі сялянамі, для якіх не хапіла б хутароў. Такім чынам, стварыўся б у вёсцы замест буйнай і сярэдняй зямельнай буржуазіі – па нацыянальнасці польскай і рускай – новы клас дробных вытворцаў-хутаран, па нацыянальнасці беларускі. Як зазначае сам А. Луцкевіч: “Я лічыў, што хутаране-кулакі стануць на чале нараджаючагася беларускага народа і што дзякуючы матэрыяльнаму забеспячэнню, з гэтага асяроддзя будзе вырастаць беларуская нацыянальная інтэлігенцыя, атрымліваючы адукацыю ў сярэдніх і вышэйшых школах. Такім чынам, мой праект зямельнай праграмы, вырашаючы зямельную праблему толькі ў адносінах да той часткі сялян, якой дастануцца добраўпарадкаваныя хутары, пакідаў незадаволенай астатнюю масу сялянства, пераводзячы яе ў становішча зямельнага пралетарыяту” [3, с. 131].

На гэтым партыйным з’ездзе аграрная праграма Антона Луцкевіча атрымала падтрымку і была прынята як праграма БСГ. Яна складалася з наступных пунктаў:

“1) Утварэнне абласных зямельных фондаў з касцёльных, царкоўных, удзельных, кабінецкіх, манастырскіх і прыватнаўласніцкіх зямель.

2) Малазямельным і беззямельным працуючым на зямлі неабходна раней за ўсіх адкрыць доступ да зямлі для пажыццёвага карыстання; перавага на карыстанне ўчасткамі грамадскай зямлі, якую пакінуў земляроб па прычыне непрацаздольнасці, смерці і г.д., аддаецца яго бліжэйшым супрацоўнікам. Доступ да зямлі, па магчымасці, павінен быць забяспечаны матэрыяльнай падтрымкай тых, хто адчувае патрэбу ў ёй для завядзення гаспадаркі.

3) Зямельная рэнта павінна быць уласнасцю края і перайсці ў карысць самапрацуючых абласных арганізацый.

4) Абласныя дзяржаўныя арганізацыі вызначаюць форму і парадак канфіскацыі зямель.

5) Дробныя самакіраваныя арганізацыі вызначаць колькасць зямлі, неабходнай для забяспячэння працоўных на зямлі.

БСГ патрабуе перахода ў грамадскую ўласнасць лясоў, паш і вадзяной сілы" [2, с. 161].

Аграрная прагрма ІІ з'езда БСГ была арыентавана не на рэвалюцыю, а на рэфармісцкі, па сутнасці, ліберальны шлях. Такі паварот быў не выпадковым, ён характэрны для дробнай буржуазіі і адлюстроўваў сабой яе хістанні. Асабліва гэта адносіцца да заможных пластоў сялянства, якія ўсё болей сталі цягнуць у бок лібералаў. Гэты ж момант вызначыў і далейшую эвалюцыю грамадоўцаў да "нашаніўства", перыяду, калі БСГ зрабіла вялікую эвалюцыю ўправа, паступова адмаўляючыся ад сваіх радыкальных і нават рэвалюцыйных заклікаў 1905 г.

Доўгай была на з'ездзе дыскусія аб тэроры. Тут найбольш моцна выявіліся эсэраўскія ўплыў і настрой перажываемага моманту. Але па гэтым пытанні з'езд разышоўся з эсэрамі, была прынята формула, якая прызнавала тэрор толькі як сродак самааховы, а не наступлення. БСГ стаяла на пазіцыях масавай барацьбы, а не індывідуальных выступленняў [1, с. 25].

З'езд таксама прыняў цэлы шэраг рэзалюцый культурна-нацыянальнага характару, якія вызначылі ўвесь далейшы шлях беларускага адраджэння: аб беларускай школе, друку, беларускай мове і г.д. [1, с. 25].

Неабходна адзначыць яшчэ адно цікавае пытанне, якое было разгледжана на гэтым з'ездзе, аб чым паведамляе А.Луцкевіч. Як вядома, беларусы па свайму веравызнанню падзяляліся на праваслаўных і каталікаў, пры гэтым першыя – праз праваслаўную царкву – зведалі русіфікацыю, другія ж – праз каталіцкі касцёл – апалячванне. У выніку сярод сялян-беларусаў адной вёскі, з-за барацьбы паміж праваслаўным і каталіцкім духавенствам, пачыналася варожасць і барацьба. Праваслаўныя лічылі сябе "рускімі" і праяўлялі варожасць да сваіх жа братоў каталіцкага веравызнання, якіх называлі "палякамі". Дык вось, у сувязі з гэтым у беларускіх дзеячоў узнікла ідэя, якую падтрымлівалі і грамадоўцы, што дзеля захавання адзінства беларускага народа, які падзяляе веравызнанне, неабходна ўзрадзіць веравызнальнае адзінства – узрадзіць царкоўную унію. Гэта ідэя знайшла свае адлюстраванне на ІІ партыйным з'ездзе Грамады, дзе было абмеркавана гэтае пытанне. Па ім была прынята рэзалюцыя, у якой вызначалася, што з'езд лічыць магчымым для членаў БСГ актыўна садзейнічаць правядзенню царкоўнай уніі на Беларусі [3, с. 131].

З'езд распрацаваў Статут партыі і выбраў ЦК, у склад якога ўвайшлі А. Луцкевіч, І. Луцкевіч, В. Іваноўскі і А. Бурбіс [1, с. 25].

Пасля з'езду праца БСГ не ішла ў адным строга вызначаным напрамку, яна раскідвалася ў розныя бакі. Гэта часткова тлумачыцца тым, што актыў партыі не меў магчымасці ахапіць тую шырокаю хвалю рэвалюцыйнага ўздыму, якая захапіла Беларусь. Але разам з тым БСГ у 1906 г. праводзіць значную працу як сярод сялян і рабочых, так і сярод настаўніцтва і вучнёўскай моладзі. Цэлы шэраг нелегальных сялянскіх сходаў адбываецца па ініцыятыве Грамады.

**Заключэнне.** Такім чынам, на ІІ з'ездзе БСГ была прынята партыйная праграма, якая вызначыла мэты партыі па самых актуальных для насельніцтва Беларусі пытаннях – палітычныя свабоды, аўтаномія Беларусі, рабочае заканадаўства, аграрнае пытанне. На з'ездзе былі разгледжаны і пытанні аб царкоўнай уніі, якая б садзейнічала аб'яднанню беларускага этнасу, аб развіцці нацыянальнай адукацыі і культуры, аб выкарыстанні тэрору як сродку барацьбы, партыя выступіла за масавую барацьбу, а не індывідуальны тэрор. На з'ездзе было пацверджана, што Беларуская Сацыялістычная Грамада ставіць сваёй канчатковай мэтай ажыццяўленне сацыялістычнага ладу праз развіццё міжнароднай класавай барацьбы і сацыяльнай рэвалюцыі.

1. Луцкевіч, А. За дваццаць пяць гадоў (1903–1928): Успаміны аб працы першых беларускіх арганізацыяў: Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада / А. Луцкевіч. – Вільня : Белар. Выдавецкае Тав-ва, 1928. – 52 с.

2. Шлюбскі, А. Да гісторыі БСГ / А. Шлюбскі // Полымя. – 1925. – № 5. – С. 157–163.

3. Собственноручные показания А.И. Луцкевича. 30 октября 1939 г. // Неман. – 1995. – № 1. – С. 128–158.